Болбас, В. С. Канцэптуальна-гістарычныя асновы арганізацыі маральнага выхавання ў сучаснай Беларусі / Болбас В. С. // Идейно-нравственное саморазвитие личности : сборник научных статей / Министерство образования Республики Беларусь, Учреждение образования «Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины» ; [редколлегия: В. П. Горленко (ответственный редактор) и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2011. – С. 34–46.

**Болбас В.С.,**
**кандыдат педагагічных навук, дацэнт УА МДПУ імя Шамякіна**

# КАНЦЭПТУАЛЬНА-ГІСТАРЫЧНЫЯ АСНОВЫ АРГАНІЗАЦЫІ МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ

## 1. Пастаноўка праблемы

Развіццѐ агульначалавечай культуры вызначаецца ўзроўнем гуманізацыі адносін у грамадстве, сцвярджэннем прыярытэтнасці маральных каштоўнасцей ва ўсіх праявах чалавечага жыцця. Найважнейшым механізмам актуалізацыі і рэалізацыі маральна-гуманістычных ідэй як нормы жыцця грамадства ўвогуле і кожнай канкрэтнай асобы з'яўляецца выхаванне, якое вырашае двуадзіную задачу: далучае чалавека да сацыяльнага вопыту ва ўсіх яго формах, а таксама развівае індывідуальныя здольнасці, рысы і якасці кожнага. Прычым, абапіраючыся на набытку папярэднікаў, сѐння іх нашчадкі, урэшце рэшт, прыйшлі да цвѐрдай высновы, што выключная важнасць выхавання бачыцца не ў развіцці інтэлекта, узбраенні яго ўсѐ новымі і новымі ведамі, а ва ўдасканаленні маральна-духоўных якасцей асобы.

Сучасная рэчаіснасць быцця нашага народа адзначана тым, што ѐн павінен супрацьстаяць або даваць адказы на наступныя культурна-гістарычныя выклікі: радыкальныя змены ў свядомасці людзей у сувязі з фарміраваннем рыначных адносін, праблемы глабалізацыі і наступ заходняй масавай культуры, разбурэнне традыцыйнага ўкладу жыцця і г.д. Таму стратэгічна значнай задачай педагогаў-навукоўцаў і практыкаў з'яўляецца пошук новых падыходаў да вырашэння адзначаных праблем, стварэнне ўмоў і механізмаў захавання пераемнасці і зацвярджэння ў грамадстве ідэалаў духоўнасці і гуманізму. Гістарычны вопыт даказвае, што па-сапраўднаму моцнымі былі тыя дзяржавы, грамадствы, якія ў сваім эканамічным, палітычным і культурным развіцці абапіраліся на здабыткі папярэдніх пакаленняў, на тыя светапоглядныя арыентацыі, годнасць якіх пацвярджалася ўсім ходам гістарычнага развіцця народа. Менавіта духоўныя каштоўнасці, што вынікаюць з глыбінь народнага жыцця і якія складаюць яго ментальную характарыстыку павінны выконваць ролю мабілізуючага пачатку ў развіцці сучаснага грамадства.

З першых этапаў цывілізацыйнага развіцця ўсходніх славян, у тым ліку і беларусаў, праблема маральнай дасканаласці асобы і грамадства з’яўлялася галоўнай, сэнсаўтваральнай для ўсѐй іх культуры. З часоў Кіеўскай Русі (X–XIII стст.) вядучай парадыгмай маральна-выхаваўчых ідэй з’яўлялася засваенне і распаўсюджванне хрысціянскай сістэмы каштоўнасцей пры захаванні пэўных язычніцкіх асноў, якія з’яўляліся ў той час трывалым падмуркам народных педагагічных уяўленняў. Асноватворнымі сродкамі маральнага выхавання з’яўляліся рэлігія, асвета, праца. Хрысціянства ставіць пытанне аб свабодзе чалавека рабіць маральны выбар і адначасова несці адказнасць за свае ўчынкі. Этыка-педагагічная спадчына Беларусі перыяду Вялікага княства Літоўскага ўжо адзначаецца зараджэннем і станаўленнем рэнесансна-гуманістычных падыходаў да маральнага выхавання. Развіваючы дасягненні этыка-педагагічнай думкі X–XIII стст., айчынныя мысліцелі эпохі Адраджэння ўказвалі, што маральна-духоўнае ўдасканаленне з’яўляецца найважнейшым напрамкам станаўлення асобы. Мараль узнімалася да ўзроўню вызначальнага фактару фарміравання кожнага асобнага чалавека і грамадства ўвогуле.

Падчас адукацыйных рэформ апошняй чвэрці XVIII ст. адначасова з асветніцкай інтэнцыяй часу на дзяржаўным узроўні абгрунтоўваецца думка, што безумоўнае і дынамічнае развіццѐ адукацыі мэтазгодна толькі пры ўмове ўдасканалення ѐю маральнасці асобы і павышэння духоўнага ўзроўню грамадства. Аб шырокай падтрымцы і далейшым развіцці падобных ідэй сведчыць тое, што ў наступным XIX ст. яны былі глыбока ўспрыняты студэнцкай моладзю. У цэнтры адукацыі беларускіх зямель, Віленскім універсітэце, былі створаны шырокавядомыя таварыствы філаматаў і філарэтаў, якія вылучалі мэту – з дапамогай асветы, маральнага выхавання – дабіцца росквіту свайго краю.

Досыць супярэчлівы і часта скажоны характар у параўнанні з асноўнымі накірункамі развіцця сусветнай цывілізацыі мелі маральна-выхаваўчыя падыходы ў перыяд панавання камуністычнай ідэалогіі, але прызнанне іх значнасці і многія практычныя дасягненні заслугоўваюць адпаведнай увагі і пільнага асэнсавання.

Такія гісторыка-метадалагічныя асновы арганізацыі выхаваўчага працэсу вымушаюць і сѐння сфармуляваць у адпаведнасці з патрабаваннямі часу канцэптуальныя падыходы ў маральным выхаванні, што грунтуюцца на выпрабаванай жыццѐм і часам спадчыне папярэдніх пакаленняў. Самым галоўным у гэтай справе з’яўляецца выяўленне ролі маральнасці ў станаўленні асобы і значэння маральнага выхавання ў развіцці грамадства.

## 2. Роля і месца маральнага выхавання ў жыцці грамадства

З якіх бы навукова-метадалагічных падыходаў не разглядалася цывілізацыйнае развіццѐ грамадства і ў яго кантэксце станаўленне кожнай асобы адназначна можна канстатаваць, што менавіта маральнасць робіць чалавека чалавекам. Толькі высокі маральна-духоўны ўзровень развіцця індывіда, умацаваны адукаваным і інтэлектуальным розумам, выдзяляе чалавека з ліку ўсіх тварэнняў прыроды і ўсемагчымых суперскладаных кібернетычных машын, якія ѐсць і могуць з'явіцца на свет у будучым.

Маральнасць асобы, маральна-духоўны стан грамадства павінны разглядацца як найгалоўнейшыя арыенціры і найважнейшыя крытэрыі развіцця кожнага індывіда і людской супольнасці ўвогуле. Выснова аб прыярытэтнасці маральнага выхавання ў параўнанні з іншымі выхаваўчымі накірункамі з'яўляецца несумненнай і бясспрэчнай. Развіццѐ агульнай асветы не можа разглядацца інакш, чым у якасці падмурку для маральна-духоўнага ўдасканалення грамадства і кожнага яго члена. Прафесіянальная адукацыя разам з падрыхтоўкай высокакваліфікаваных, кампетэнтных спецыялістаў павінна фарміраваць у іх высокія агульначалавечыя, маральныя якасці. Наогул, сучасны накірунак у развіцці навукі, розуму і інтэлекту не толькі не можа ігнараваць маральнай сферы, а наадварот прызваны садзейнічаць яе пашырэнню і ўдасканаленню. З іх дапамогай забяспечваецца больш эфектыўнае асэнсаванне і засваенне маральных норм і прынцыпаў арганізацыі асабістага і супольнага жыцця. Найважнейшы аспект разумовага развіцця бачыцца ў фарміраванні найкаштоўнейшай яго ўласцівасці – здольнасці самасвядомасці, а не самаўзвышэння. Толькі пры такім падыходзе магчымы выхад з духоўнага цемрашальства. Больш глыбокае і трывалае фарміраванне маральнай свядомасці, якое немагчыма без апоры на рацыянальную рэфлексію, дазволіць абагачаць адпаведныя ўчынкі і паводзіны асобы, што вядзе да ўздыму маральнай культуры грамадства.

Нават пры сучасных тэмпах развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу няцяжка ўявіць магчымыя наступствы недахопаў маральнага ўдасканалення грамадства ў спалучэнні з гіганцкімі сіламі, якімі ўсѐ ў большай ступені авалодвае значная колькасць насельнікаў Зямлі і ад напрамкаў і характару іх выкарыстання залежыць будучае планеты і не толькі яе.

Высокімі маральнымі пачаткамі павінны быць напоўнены паўсядзѐннае жыццѐ, праца, любыя іншыя аспекты жыццядзейнасці. Найважнейшая задача фізічнага развіцця асобы заключаецца ў суправаджэнні маральна-этычнай скіраванасці яго выкарыстання. Сіла цела ўплывае на сілу духу. Эстэтычнае і экалагічнае выхаванне з'яўляюцца падсістэмамі ў адносінах да агульнай маральна-выхаваўчай сістэмы і пры ўсѐй іх самастойнасці, самазначнасці і самадастатковасці павінны будавацца вакол трывалага сістэмаўтваральнага маральнага стрыжня.

Спецыфікай маральнага выхавання ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляецца канфесійная і сацыяльная неаднароднасць грамадства, адкрытасць нашага соцыума для культурных выклікаў з боку як заходняй, так і ўсходняй цывілізацый. Этыка-педагагічная думка Беларусі фарміравалася на аснове творчага сінтэзу каштоўнасцей праваслаўнай, каталіцкай, пратэстанцкай культуры са здабыткамі народнай педагагічнай спадчыны. У выніку яна стала ў значнай ступені талерантнай, адкрытай для творчага засваення іншых светапоглядных пазіцый, дынамічнай і шматбакова арыентаванай. Гэта робіць яе дасягненні яшчэ больш каштоўнымі для выкарыстання пры арганізацыі і ажыццяўленні маральнага выхавання на сучасным этапе.

Наша Радзіма з поспехам прайшла першапачатковы этап станаўлення сваѐй дзяржаўнасці, з годнасцю вытрымала іспыты на палітычную і сацыяльна-эканамічную стабільнасць. Сѐння адбываецца працэс яднання народа ў імя росквіту сваѐй Айчыны. Зрабіць яго больш паспяховым і эфектыўным можна толькі пры ўсеагульным маральным аздараўленні грамадства на аснове традыцыйна-ментальных каштоўнасцей беларусаў, якія дазволілі нашаму народу заняць сваѐ пачэснае месца ў сусветнай цывілізацыйнай прасторы.

Базавая сістэма маральных норм непасрэдна адлюстравана ў дзяржаўных законах. У выпадку, калі такія маральныя нормы з’яўляюцца асабістымі перакананнямі чалавека, то і адпаведныя законы прымаюцца і выконваюцца ім свядома, добраахвотна, згодна ўласнага сумлення і маральнага абавязку. Такім чынам, свабоднай і законапаслухмянай можа быць толькі высокамаральная асоба. Само ж маральнае выхаванне ў сутнасным напаўненні павінна абапірацца на сістэму грамадскіх каштоўнасцей, уласцівых дадзенаму перыяду.

## 3. Каштоўнасныя асновы арганізацыі маральнага выхавання

На працягу цывілізацыйнага развіцця народа Беларусі склалася пэўная сістэма светапоглядных каштоўнасцей, якая ўяўляе сабой падмурак пабудовы ўсяго маральна-выхаваўчага працэсу. Сама сістэма гістарычна ўтварылася ў выніку сінтэзу трох асноўных груп духоўна-вартасных арыентацый арганізацыі грамадскага ўладкавання: традыцыйна-пабытовая педагагічная культура народа, хрысціянская этыка, дзяржаўная ідэалогія. Са старажытных часоў нашымі продкамі быў выпрацаваны шэраг норм і правіл арганізацыі супольнага жыцця, якія і склалі аснову народнай маралі. Асноўнай іх асаблівасцю было ігнараванне інтарэсаў асобнага чалавека ў параўнанні з інтарэсамі абшчыны. Калектывісцкая арыентацыя была першаасновай развіцця маралі ў язычніцкі перыяд, і яна ж як нельга лепш арганічна ўпісалася ў хрысціянскія ўяўленні зямнога існавання чалавека, дзе,

зыходзячы з прынцыпаў сабornасці, лейтматывам дзейнасці ўсіх і кожнага было імкненне да агульнага дабра.

Адначасова з арыентацыяй да абшчыннасці, калектывізму хрысціянства ўздымала на нябачаную дагэтуль духоўную вяршыню кожнага чалавека незалежна ад яго ўзросту, полу, маёмаснага, разумовага і іншага стану. Кожны індывід надзяляецца свабодай волі, магчымасцю самастойнага маральнага выбару, але ж на яго ўскладваецца і адказнасць за наступствы абраных памкненняў і шляхоў сацыяльна-духоўнай жыццядзейнасці. Абапіраючыся на такія зыходныя аксіёмы быцця, у сілу гістарычных абставін паступова ўсталёўваецца ідэя аб самазначнасці, самадастатковасці кожнага чалавека, які мае права на шчасце, годнае існаванне ў зямны прамежак часу, але ўсё гэта можа і павінна ўмяшчацца ў рэчышча імкнення да агульнага дабра. На аснове такога духоўна-маральнага падмурку склаўся менталітэт беларускага народа і ў гэтым залог яго ўстойлівасці перад выклікамі гісторыі, гарантыя збераження сацыяльна-культурнай ідэнтычнасці.

З цягам часу этна-нацыянальныя каштоўнасці беларусаў сінкрэтычна зліліся ў адзінае цэлае з хрысціянскімі, і зараз уяўляюць магутны і трывалы пласт маральнай культуры, які можна разглядаць як першааснову для арганізацыі дзяржавай мерапрыемстваў па ўдасканаленню сваёй моцы. Як вядома, развал краіны пачынаецца з развалаў душ яе насельнікаў, таму дзяржавай павінны прымацца ўсемагчымыя захады для фарміравання базавай сістэмы каштоўнасных арыенціраў, што аб'ядноўваюць грамадзян у адзіную гісторыка-культурную і сацыяльную супольнасць са станоўчай грамадзянскай ідэнтычнасцю. Упаўне заканамерна, што дзяржаўная ідэалогія як адпаведная сістэма поглядаў адносна мінулага нашага народа, спосабаў яго яднання, формаў узаемаадносін з іншымі народамі, а таксама напрамкаў гістарычнага развіцця ўяўляе сабой важнае каштоўнаснае ўтварэнне, якое самым непасрэдным чынам уплывае на мэту, змест і шляхі арганізацыі маральна-духоўнага выхавання насельніцтва. І ў гэтым працэсе фарміраванню высокай сацыяльнай і грамадзянскай адказнасці павінна быць адведзена істотнае месца.

Таму ў аксіялагічным пераліку вартасных асноў арганізацыі жыцця важнае месца займаюць справядлівасць, сумленнасць, чэсць. Такія каштоўнасці абгрунтоўваюцца нашым народам у якасці ўніверсальных катэгорый, адзіных для ўсіх слаёў грамадства, сутнасць якіх зводзіцца да ўсведамлення таго, што кожны павінен атрымаць ад іншых не больш таго, што даў ім. Усё гэта прызвана стварыць трывалую аснову для канструктыўнага ўздзеяння на грамадскую мараль і грамадзянскую свядомасць шляхам духоўнай інтэграцыі людской супольнасці праз выразнасць і недвухсэнсоўнасць жыццёвых арыенціраў. Сфарміраваныя на

працягу гістарычнага развіцця грамадска-духоўныя каштоўнасці фіксуюць адпаведныя нормы і агульныя падыходы ў арганізацыі супольнага жыцця, што вызначальным чынам уплываюць на распрацоўку маральна-выхаваўчых мэты і задач.

### 4. Мэта і задачы маральнага выхавання

Сацыяльна-маральныя каштоўнасці як найбольш статычныя састаўляючыя менталітэту народа пад уплывам шэрагу фактараў з цягам часу дапускаюць пэўныя змены, што, у сваю чаргу, мяняе грамадскія нормы і правілы і прыводзіць да карэкціроўкі мэты і задач маральнага выхавання. Працэс мэтавызначэння ў педагогіцы звычайна завяршаецца стварэннем вобразу ідэальнага чалавека. Грамадска-выхаваўчая вартасць маральнага ідэалу заключаецца ў тым, што ѐн увасабляе не толькі мэту і задачы, а і выступае ў якасці пабуджальнай сілы, матыву самаўдасканалення; як узор для пераймання ѐн іграе ролю выхаваўчага сродку, з'яўляецца крытэрыем выхаванасці асобы.

Гістарычна маральны ідэал беларускага народа грунтаваўся на сукупнасці норм векавых традыцый і падпарадкоўваўся іх абшчыннай скіраванасці. Хрысціянства ўносіць у разуменне ідэалу ярка выражаную спавернутасць да ўласнага ўнутранага свету. Хрысціянскі маральны ідэал хоць і ўяўляў сабой узор духоўнай дасканаласці, але не з'яўляўся трафарэтам для імітацыі і капіравання памкненняў, дзеянняў, учынкаў і паводзін. Ён скандэнсаваў у сабе сістэму празмерна магчымых, недасягальных духоўных каштоўнасцей, якія ўвасаблялі абсалютныя ісціну, дабро і прыгажосць.

Эпоха Адраджэння ўнесла ў сутнаснае напаўненне маральнага ідэалу арыентаванасць да ўсебаковага гарманічнага развіцця асобы, заснаваную на антычнай формуле "калакагатхіі". Маральная характарыстыка індывіда з'яўлялася вызначальнай, але сінкрэтычна злівалася са шматбаковымі напрамкамі ўдасканалення плоцевай і духоўнай састаўляючых чалавека. Эпоха Асветніцтва ўзбагаціла маральны ідэал інтэлектуальна-разумовымі параметрамі. Веды, адукаванасць напоўніліся высокім этычным зместам.

На працягу далейшай гісторыі цывілізацыйнага развіцця мэце і задачам маральнага выхавання паступова надаваўся агульначалавечы характар, яны ўсѐ вышэй уздымаліся над саслоўнымі, класавымі, нацыянальнымі і канфесійнымі адрозненнямі і грунтаваліся на сацыяльна-духоўных асаблівасцях усяго грамадства. Маральнае мэтавызначэнне такім чынам набывала дэмакратычную арыентацыю. Такое пераасэнсаванне маральнага ідэалу ў бок ўдасканалення зямнога жыцця прыводзіла да высновы, што ўсе задачы маральнага выхавання павінны, у рэшце рэшт, сыходзіцца на праблеме выхавання дзейснай, актыўнай асобы. Маральнасць

асобы вызначаецца не толькі і не столькі ўзроўнем развіцця яе свядомасці, адпаведнымі ведамі, а канкрэтнымі дзеяннямі, учынкамі і справамі.

Такім чынам, зыходзячы з сѐнняшняй рэчаіснасці і дасягненняў духоўнага вопыту продкаў, мэта маральнага выхавання заключаецца ў фарміраванні дабрачыннай, цнатлівай, сацыяльна арыентаванай асобы, якая спалучае ў сабе культуру знешнюю і ўнутраную, патрыятызм і актыўную грамадзянскую пазіцыю. Галоўным выступае фарміраванне ўнутранай скіраванасці да дабрадзейнага жыцця, што магчыма праз "самабудаўніцтва" духоўнага свету індывіда ў працэсе засваення ім каштоўнасцей айчыннай культуры, з наступным далучэннем да агульнапланетарных набыткаў. Рэаліі сучаснага соцыуму патрабуюць новага прачытвання педагогікі духоўнага самаўдасканалення, якая сваімі каранямі зыходзіць ад хрысціянскага праваслаўнага менталітэту. Замацаванне адзінства маральнага і духоўнага ва ўнутранай структуры асобы з'яўляецца найважнейшай дамінантай мэтавых установак маральнага выхавання.

Па сутнасці ўсе задачы маральнага выхавання можна звесці да фарміравання асобы з наступнай арыентаванасцю:

– не рабіць іншым таго, чаго не жадаеш сабе;
– любыя памкненні і дзеянні накіраваны на дабро іншым людзям;
– быць патрыѐтамі свайго народа, сваѐй краіны;
– маральнасць паводзін не можа выходзіць за межы законапаслухмянасці.

## 5. Змест маральнага выхавання

У адрозненне ад мэты і задач маральнага выхавання, якія вызначаюць агульныя арыенціры, жадаемы вынік фарміравання асобы і грамадства, яго змест з'яўляецца канкрэтнай сутнасцю выхаваўчай дзейнасці, ѐн раскрывае і дэталізіруе рэальна-сэнсавае іх напаўненне і прадстаўляе маральны ідэал у сукупнасці адпаведных рыс і якасцей.

Змест маральнага выхавання фарміраваўся аб'ектыўна ў працэсе сацыяльнай практыкі і ў абагульненым выглядзе перадаваўся з пакалення ў пакаленне. Са старажытных часоў сярод асноўных рыс і якасцей чалавечай асобы народ Беларусі найважнейшае месца адводзіў чалавекалюбству, чуласці, шчодрасці, спагадлівасці, добразычлівасці, міласэрнасці, дабрыні. Выхаванне пачуцця любві – любві да бліжняга, любві да людзей наогул, любві да жывой і нежывой прыроды, любві да жыцця з'яўляецца найважнейшай складаемай зместу маральнага выхавання і на сучасным этапе.

Шматвяковы выхаваўчы вопыт пераканаўча паказвае, што любоў да чалавецтва не можа быць сфарміравана без любві да сваѐй Радзімы, свайго народа. Даследчыкі адзначаюць, што ва ўсходніх славян патрыятызм

ўздымаецца да ўзроўню вызначэння сэнсу жыцця, вымярэння чалавечай годнасці. Прычым, патрыятычна-выхаваўчыя накірункі ў беларусаў не дапускаюць нацыянальнай фанабэрыі, пыхлівасці, знявагі да іншых народаў. Невыпадкова, што характарыстычна вызначальнай якасцю для прадстаўнікоў беларускага народа з'яўляецца талерантнасць. Прычым, гэтае паняцце для беларусаў мае досыць шырокія межы – яно не завяршаецца толькі "верацярпімасцю", а адлюстроўвае павагу да іншых думак, поглядаў, меркаванняў, скіроўвае на паважлівыя адносіны да з'яў і прадстаўнікоў іншых культур.

Да першасных маральных якасцей беларусы адносяць шчырасць і праўдзівасць. Распрацоўшчыкі айчыннай этыка-педагагічнай думкі не без падстаў адзначаюць, што шчырасць, сумленнасць і праўдзівасць з'яўляюцца вянцом маральнасці чалавека, яго духоўнага свету. Наогул маральны кодэкс беларускага народа ўяўляе сабой даволі багатую палітру асобасных рыс і якасцей чалавека. Характарыстычнай іх асаблівасцю з'яўляецца тое, што многія з іх не маюць непасрэднага дачынення да маральнай сферы, а ў шырокім разуменні напаўняюцца глыбокім этычным сэнсам. Так, працалюбства ў беларусаў адносіцца да адной з асноватворных маральных якасцей, але і ўхваляецца толькі ў выпадку яго скіраванасці да агульнага дабра. Адмоўную рэакцыю выклікае нават самая старанная праца з мэтай нажывы, ці яшчэ горш, калі яе вынікі прыносяць каму-небудзь шкоду.

У старажытныя крыніцы ўваходзяць каранямі свайго развіцця такія маральныя якасці, як шанаванне бацькоў, павага да старэйшых. Гістарычныя асаблівасці фарміравання беларускай народнасці абумоўліваюць уключэнне ў змест маральнага выхавання сціпласці, паслухмянасці, цярплівасці, разважлівасці, памяркоўнасці. Прычым, гэтыя якасці павінны фарміравацца не ў духу самапрыніжэння асобы, роспачы і безнадзейнасці, а найперш дзеля супрацьпастаўлення ганарлівасці, пыхлівасці, імпульсіўнасці. На іх аснове павінны фарміравацца мэтанакіраванасць, самакрытычнасць, жыццярадаснасць, бадзѐрасць.

Дзяржава і грамадства зацікаўлены ў развіцці такіх рыс і якасцей асобы, як пачуццѐ ўласнай годнасці, аптымізм, упэўненасць у сѐнняшнім і заўтрашнім дні. Адзначаныя маральна-валявыя якасці садзейнічаюць развіццю ў чалавека іншых сабе падобных, якія яшчэ вышэй ўздымаюць маральна-духоўны ўзровень асобы. Так, напрыклад, храбрасць, смеласць, мужнасць беларусы разглядаюць не толькі як рысы і якасці, якія могуць быць прыгоднымі для чалавека ў нейкіх надзвычайных абставінах, а абгрунтоўваюць неабходнасць іх наяўнасці ў паўсядзѐнным жыцці.

Змест маральнага выхавання амаль поўнасцю залежыць ад размежавання дабра і зла, дабрачыннасці і заган. Таму побач з сукупнасцю

становучых маральных рыс і якасцей асобы этыка-педагагічная думка беларускага народа вялікую ўвагу ўдзяляе раскрыццю іх супрацьлегласцей, якія, з аднаго боку, не дазваляюць індывіду дасягнуць духоўных вяршынь, а з іншага – з'яўляюцца тымі прыступкамі, пераадоленне якіх маральна гартуе кожную асобу і грамадства ў цэлым. Да ліку такіх адносяцца: схільнасць да крадзежу, разбою, ілжы, п'янства, пралюбадзейства, а таксама зайздрасць, сквапнасць, помслівасць, падхалімаж, зазнайства, крывадушнасць, эгаізм і інш.

Вызначэнне мэты, задач і зместу маральнага выхавання абумоўлівае неабходнасць распрацоўкі практычных шляхоў яго ажыццяўлення.

## 6. Прынцыпы арганізацыі маральнага выхавання

Адной з найважнейшых высноў, якая робіцца ў айчыннай этыка-педагагічнай думцы, з'яўляецца патрабаванне пабудовы маральна-выхаваўчага працэсу на інтэлектуальна-разумовых асновах. З аднаго боку агульнае развіццѐ асветы і адукацыі павінны быць трывалым падмуркам удасканалення маральна-духоўнага свету кожнай асобы і грамадства ўвогуле. Без адпаведнага разумовага ўзроўню дабрыня можа ператварыцца ў сур'ѐзны недахоп, бо чалавек можа зблытацца ў ацэнцы з'яў і выбары адпаведнай лініі паводзін. Таму адна з асаблівасцей развіцця навуковых ведаў ва ўсходніх славян у пераважнай увазе да чалавека як асновы Сусвету, у спасціжэнні сэнсу жыцця і распрацоўцы шляхоў яго арганізацыі. З другога боку, у агульным адукацыйным развіцці асобы істотнае месца адводзіцца непасрэдна маральнай асвеце. Сукупнасць маральных ведаў скіроўвае чалавека на шлях дабрачыннага жыцця, утварае падмурак для развіцця адпаведных перакананняў, на аснове якіх будуецца пэўная лінія паводзін. Хоць і не заўсѐды разумова-інтэлектуальны патэнцыял індывіда і нават маральная дасведчанасць трансфармуюцца ў дабрачыннасць, але ж увогуле яны не сумяшчальныя з маральным злом асабліва, калі ўяўляюць сабой істотную ступень засваення культурных набыткаў папярэдніх пакаленняў. Важным фактарам фарміравання маральных перакананняў з'яўляецца ўздзеянне на пачуцці. Вельмі многае ў арганізацыі маральнага выхавання залежыць ад настаўніка-выхавацеля. Гістарычны вопыт нашага народа пераканаўча паказвае неабходнасць яго вядучай ролі ў арганізацыі выхаваўчага працэсу. Само маральнае выхаванне, абапіраючыся на прынцып культураадпаведнасці, павінна будавацца ў Беларусі на гарманічным спалучэнні калектывісцкіх і індывідуалістычных падыходаў. Самыя сур'ѐзныя задачы ў маральна-духоўным развіцці дзяцей ускладаюцца на сям'ю. Стварэнне адпаведнага асяроддзя, з як мага большым духоўна-маральным узроўнем прызвана забяспечыць адзінства і ўзаемаўзгодненасць намаганняў у выхаванні асобы.

На працягу гісторыі развіцця айчыннай этыка-педагагічнай думкі істотным зменам быў падвержаны характар адносін да выхаванцаў. Калі на ранніх этапах развіцця маральнага выхавання побач з наяўнасцю шматлікіх табу і забарон панаваў досыць мяккі характар адносін да гадаванцаў, то з расслаеннем грамадства паступова ѐн прымае досыць суровыя і жорсткія формы. З часоў жа эпохі Адраджэння на змену аўтарытарызму прыходзяць падыходы гуманістычнай педагогікі, і ў сучасны момант суб’ект-суб’ектныя адносіны паміж настаўнікам і вучнем цалкам і поўнасцю павінны вызначаць характар іх узаемаадносін. Усѐ гэта прыводзіць да ўсталявання ў маральным выхаванні прынцыпу актыўнасці выхаванцаў, без чаго практычна гэты працэс немагчымы.

Асноватворным прынцыпам якога нельга не прытрымлівацца ў маральным выхаванні з’яўляецца прынцып прыродаадпаведнасці. Сутнасць яго вельмі шырокаабдымная, бо маецца на ўвазе як узгодненасць з навакольным асяроддзем, так і з прыродай чалавека, яго індывідуальнымі ўзаемасувязямі і асаблівасцямі.

Эфектыўнасць маральна-выхаваўчага працэсу ў многім залежыць ад прытрымлівання прынцыпу дакладнай прадуманай паслядоўнасці яго ажыццяўлення, пачынаючы ад вызначэння адпаведнай мэты, пастаноўкі канкрэтных задач і выбары шляхоў і падыходаў да іх вырашэння.

Выніковасць маральна-выхаваўчых намаганняў залежыць ад шэрагу патрабаванняў метадычнага характару, такіх як забеспячэнне даступнасці, зразумеласці для выхаванцаў зместу маральнага выхавання і адпаведных дзеянняў настаўнікаў-выхавацеляў. Аналагічную ролю выконваюць прынцыпы нагляднасці, сістэмнасці.

Сукупнасць вышэйадзначаных прынцыпаў арганізацыі маральнага выхавання патрабуе распрацоўку і выбар адпаведных шляхоў яго ажыццяўлення.

## 7. Метады і сродкі маральнага выхавання

Усведамленне таго, што кожны індывід, у рэшце рэшт, на аснове адпаведнага асэнсавання і ўласна прынятых рашэнняў здзяйсняе адпаведныя ўчынкі, вылучае метад перакананння ў якасці асноўнага метаду маральнага выхавання. Мусім заўважыць, што практычна ўсе іншыя спосабы маральна-духоўнага ўдасканалення асобы таксама маюць на ўвазе ўздзеянне на яе свядомасць. Найбольш распаўсюджанымі сродкамі гэтага метаду з’яўляюцца павучанні, угаворы, растлумачэнні, унушэнні, гутаркі, дыялогі і г.д. Асабліваe месца сярод такіх сродкаў адводзіцца кнізе, інфармацыйным сродкам, усемагчымым культурна-масавым мерапрыемствам. У хрысціянскай педагогіцы ды і наогул у маральным выхаванні вельмі важным сродкам з’яўляецца споведзь. Вялікае значэнне пры іх выкарыстанні

надаецца жывому слову выхавацеля, які павінен валодаць майстэрствам пераканання. Выхаваўчая сіла слова пры умелым яе выкарыстанні з глыбокай старажытнасці дэманстравала і дэманструе незвычайныя магчымасці. Асаблівую эфектыўнасць набывае метад пераканання пры комплексным уздзеянні на свядомасць, волю і пачуцці. Адсутнасць пры падобных падыходах насілля і забарон робіць адпаведныя паводзіны выхаванца яшчэ больш глыбокімі, устойлівымі і трывалымі.

Важнае месца ў маральна-выхаваўчым працэсе займае метад прыкладу. З аднаго боку механізм яго ўздзеяння поўнасцю заснаваны на асноўных падыходах метаду пераканання, з іншага – яго эфектыўнасць забяспечваецца схільнасцю чалавека да пераймання. Звычайна гэты метад у большай ступені абапіраецца на пачуцці, бо валодае істотным арсеналам нагляднасці, канкрэтнасці, даступнасці і зразумеласці. У маральным выхаванні з поспехам выкарыстоўваюцца як станоўчыя, так і адмоўныя прыклады. Асаблівую значнасць маюць прыклады з навакольнага жыцця. Незаменным узорам для пераймання з'яўляецца ўласны прыклад выхавацеля.

Апора на набыткі народнай педагогікі беларусаў, а таксама погляды айчынных распрацоўшчыкаў ідэй маральнага выхавання вылучае ў якасці аднаго з найважнейшых метадаў – практыкаванні ці прывучэнні. Менавіта непасрэдны ўдзел выхаванцаў у добрых справах дае грунтоўна выхаваўчы вынік. Больш таго, у адрозненне ад акадэмічнай педагагічнай навукі народная педагогіка дапускае прывучэнне праз шматпаўторную пастаянную дзейнасць нават без адпаведнага яе асэнсавання ў якасці асновы для далейшага маральнага станаўлення індывіда. Адпаведная ўвага павінна надавацца ў гэтым плане стварэнню штучных выхаваўчых сітуацый і набыццѐ адпаведнага вопыту маральных паводзін.

Істотнае месца ў маральным выхаванні займае метад заахвочвання. І хоць маральнасць асобы губляе ўсялякі сэнс, калі яна будуецца ў чаканні пэўнай адплаты за адпаведныя паводзіны, усѐ ж на розных этапах маральнага развіцця мэтазгодна і пажадана выкарыстоўваць шматлікія заахвочванні ад адабрэння, ухвалення да істотных важкіх узнагарод шматпланавага характару. Важным з'яўляецца не толькі выбар канкрэтнага сродку заахвочвання, але і ўменне належным чынам выкарыстаць яго ў якасці стымула далейшага маральнага ўдасканалення.

Зыходзячы са спецыфікі арганізацыі маральна-выхаваўчага працэсу наогул і яго асаблівасцей на сучасным этапе грамадскага развіцця, значна менш чым у папярэднія перыяды, але абдумана і ўзважана павінны выкарыстоўвацца шматлікія сродкі метаду пакарання. Гэта могуць быць і розныя спагнанні ў якасці кары за здзейсненыя ўчынкі і шматлікія неадабрэнні-перасцярогі, дакоры-асуджэнні, ганьбаванні і інш. Адна з

абавязковых умоў іх ужывання – прытрымліванне прынцыпу справядлівасці, адэкватнасці спагнання садзеянаму і недапушчэнне абразы, зневажэння чалавечай годнасці.

Адным з дзейсных, выпрабаваных жыццём і часам сродкам маральнага выхавання з'яўляецца стваральная, грамадска-карысная праца, напоўненая высокім этычным пачаткам. Духоўнае хараство, высокая маральнасць у многім залежыць ад знешняга ўплыву прыгажосці свету і яго праяў. Таму абуджэнню пачуццяў з дапамогай эстэтычнага ўдзеяння павінна надавацца істотная ўвага. Эмацыянальны стан чалавека, які ў многім вызначае яго маральнасць не заўсёды паддаецца асэнсаванню рацыяналістычным мысленнем. Маральна-выхаваўчая функцыя эстэтыкі прызвана і павінна як мага шырэй выкарыстоўвацца ў практыцы.

Многія маральна-валявыя якасці асобы з поспехам фарміруюцца ў працэсе фізічнага выхавання. Актыўна садзейнічае маральна-духоўнаму ўдасканаленню экалагічнае выхаванне. Надзвычайны маральна-выхаваўчы патэнцыял утрымліваюць правільныя адносіны да прыроды. Такім чынам, гармонія прыродных, фізічных, інтэлектуальных і духоўных пачаткаў садзейнічае дасягненню індывідам маральных вяршынь.

Увогуле ж у этыка-педагагічнай думцы Беларусі зроблена важная выснова аб недапушчальнасці ідэалізацыі асобных метадаў і сродкаў на шкоду іншым. Толькі комплексны падыход, выбар адпаведнай той ці іншай сітуацыі, сістэмы метадаў і сродкаў можа прынесці добры плён ў выхаваўчай дзейнасці.